ЗАЦВЯРДЖАЮ
Старшыня Савета ВМА па адукацыі ў галіне культуры і мастацтва
Рэктар БДУКМ
______________Ю.П.Бондар

16 красавіка 2015 г.

# П А Л А Ж Э Н Н Е
## аб парадку прысваення вучэбным выданням грыфа Вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў

## Глава 1
## Агульныя палажэнні

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак прысваення грыфа вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў (далей – ВМА) вучэбным выданням для выкарыстання.

2. У гэтым палажэнні выкарыстоўваюцца тэрміны і іх азначэнні ў тых значэннях, што вызначаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны і іх азначэнні:

аўтар (аўтарскі калектыў) – фізічная асоба або група асоб, творчай працай якіх створаны твор, што з'яўляецца аб'ектам аўтарскага права;

аўтарская даведка аб дапрацоўцы – дакумент, у якім аргументавана абгрунтоўваецца згода (або нязгода) аўтара (аўтарскага калектыву) з заўвагамі рэцэнзентаў, з апісаннем выпраўленняў і дапаўненняў паводле атрыманых заўваг;

аўтарскі арыгінал вучэбнага выдання (далей – аўтарскі арыгінал) – твор (тэкставы і (або) выяўленчы матэрыял), створаны аўтарам (аўтарскім калектывам) і прадстаўлены для рэкамендацыі ў якасці пэўнага віду вучэбнага выдання да прысваення адпаведнага грыфа;

грыф – надпіс, якая змяшчае інфармацыю аб зацвярджэнні, допуску або рэкамендацыі вучэбнага выдання ў якасці адпаведнага віду вучэбнага выдання;

рэцэнзент – спецыяліст або калектыў спецыялістаў, якія ажыццяўляюць рэцэнзаванне аўтарскага арыгінала вучэбнага выдання;

вучэбна-метадычны дапаможнік – вучэбнае выданне (друкаванае і электроннае), якое змяшчае матэрыялы па методыцы выкладання і (або) вывучэння вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны), раздзела, часткі

вучэбнага прадмета (вучэбнай дысцыпліны), адукацыйнай вобласці, а таксама па методыцы навучання і выхавання ;

дапаможнік – вучэбнае выданне (друкаванае і электроннае), прызначанае ў дапамогу практычнай дзейнасці або ў дапамогу авалодання вучэбным прадметам (вучэбнай дысцыплінай), адукацыйнай галіной;

экспертыза – працэс аналізу аўтарскага арыгінала вучэбнага выдання для ацэнкі адпаведнасці яго зместу патрабаванням, што прад'яўляюцца да вучэбных выданняў, які спрыяе павышэнню якасці вучэбных выданняў для далейшай рэкамендацыі вучэбнага выдання да прысваення грыфа.

3. Прысваенне грыфа ВМА ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, палажэннем аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы вышэйшай адукацыі, інструкцыяй аб парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў і іх выкарыстання, іншымі нарматыўнымі актамі і дадзеным палажэннем.

4. Грыф прысвойваецца аўтарскім арыгіналам, майстар-дыскам, адобраным і рэкамендаваным вучэбна-метадычным аб'яднаннем для ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы вышэйшай адукацыі, да выпуску ў якасці вучэбна-метадычных дапаможнікаў па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў.

5. Грыф ВМА сведчыць аб тым, што дадзенае вучэбнае выданне адпавядае патрабаванням пэўнага адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, вучэбнай праграме дысцыпліны і іншым патрабаванням, устаноўленым ВМА пры правядзенні экспертызы вучэбных выданняў.

6. Прысваенне грыфа ВМА рэалізуецца праз працэдуру экспертызы вучэбнага выдання, якую арганізуе адпаведны навукова-метадычны Савет (далей – НМС). На падставе вынікаў гэтай экспертызы ВМА прымае рашэнне аб прысваенні або аб адмове ў прысваенні грыфа.

7. Тэкст грыфа не можа быць зменены аўтарам (аўтарскім калектывам) або юрыдычнай асобай, індывідуальным прадпрымальнікам, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне выдавецкай дзейнасці, выдадзенае ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (далей – выдавецтва).

8. Максімальны тэрмін працы па прысваенні грыфа ВМА аднаго рукапісу не можа перавышаць чатырох месяцаў.

9. Тэрмін дзеяння прысвоенага вучэбным выданням грыфа складае пяць гадоў. У выпадку заканчэння гэтага тэрміну рашэнне аб выпуску вучэбных выданняў прымаецца ў парадку, устаноўленым Інструкцыяй аб парадку падрыхтоўкі і выпуску вучэбных выданняў для ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Глава 2
## ПАРАДАК ПРАДСТАЎЛЕННЯ МАТЭРЫЯЛАЎ У ВМА

10. Грыф ВМА прысвойваецца па заяўным прынцыпе. Аўтар (аўтарскі калектыў) накіроўвае на адрас ВМА (асабіста або па пошце) наступныя дакументы:

суправаджальны ліст на імя старшыні ВМА па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў, падпісаны кіраўніком установы вышэйшай адукацыі (для БДУКМ – вучэбнага падраздзялення), у якім даецца кароткая інфармацыя аб выданні, яго выхадныя даныя (назва рукапісу, прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (аўтараў), плануемы тыраж і год выпуску, аб’ём у друкаваных лістах), найменне і шыфр спецыяльнасці, назва дысцыпліны, па якой падрыхтаваны рукапіс, і цыкла тыпавога вучэбнага плана, да якога належыць гэтая дысцыпліна;

аўтарскі арыгінал (без рэдактарскай праўкі) вучэбнага выдання ў адным экзэмпляры;

выпіску з пратакола пасяджэння секцыі Рэдакцыйна-выдавецкага (навукова-метадычнага) савета ўстановы вышэйшай адукацыі з фармулёўкай аб мэтазгоднасці прысваення грыфа ВМА;

выпіску з вучэбнага плана;

вучэбную праграму дысцыпліны;

рэцэнзію калектыўную (кафедры адной з установ адукацыі, якая забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі ці метадычнай камісіі па спецыяльнасці органаў і ўстаноў адукацыі) і рэцэнзію індывідуальную (спецыяліста ў дадзенай галіне ведаў) (дадатак 1).

11. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб’ёмам не менш за 5 умоўных друкаваных лістоў (што прыкладна складае не менш за 85 папяровых лістоў фармату А4, шрыфт Times New Roman, памер шрыфта – 12-14).

## Глава 3
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ АБМЕРКАВАННЯ І ПРЫСВАЕННЕ ГРЫФА

12. Дакументы аўтара (аўтарскага калектыву), якія паступілі ў ВМА, накіроўваюцца ў адпаведны НМС для разглядання на пасяджэнні савета

13. У пратаколе пасяджэня НМС павінна давацца ўсебаковая і аб’ектыўная ацэнка вучэбнаму выданню, утрымліваецца аналіз метадычных станоўчых якасцяў і недахопаў, ацэньваецца навуковы ўзровень, адпаведнасць зместу і аб’ёму адукацыйнага стандарту, вучэбнаму плану і вучэбнай праграме, якасць ілюстрацыйнага матэрыялу, пералік пастаронкавых заўваг. У заключэнні пратакола

павінны ўтрымлівацца абгрунтаваныя і аргументаваныя высновы аб мэтазгоднасці або немэтазгоднасці прысваення грыфа ВМА.

14. Аўтарскі арыгінал вучэбнага выдання і ўсе дакументы могуць быць вернуты аўтару (аўтарскаму калектыву) на дапрацоўку. Тэрмін дапрацоўкі вызначаецца ў залежнасці ад характару і аб'ёму неабходных выпраўленняў (дапаўненняў). Пасля аўтарскай дапрацоўкі вучэбнае выданне з аўтарскай даведкай аб дапрацоўцы накіроўваецца для далейшага разгляду адпаведным НМС і ўнясення прапановы аб рэкамендацыі вучэбнага выдання да прысваення грыфа ВМА.

15. Выпіска з пратаколу пасяджэння НМС падпісваецца старшынёй НМС. Выпіска ў двух экзэмплярах падпісваецца старшыней НМС, адзін экземпляр прыкладваецца да пратакола пасяджэння НМС, другі экземпляр перадаецца ў Прэзідыум Савета ВМА.

16. Дакументы аўтара (аўтарскага калектыву), выпіска з пратакола пасяджэння адпаведнага НМС з унясеннем прапаноў аб прысваенні (немэтазгоднасці прысваення) грыфа перадаецца вучонаму сакратару ВМА для наступнага ўключэння ў парадак дня і разгляду на пасяджэнні Прэзідыума Савета ВМА.

17. Прэзідыум савета ВМА на падставе выпіскі з пратаколу НМС прымае рашэнне аб прысваенні грыфа, на падставе гэтага рашэння вучоны сакратар ВМА рыхтуе заключэнне ў двух асобніках. Адзін асобнік з заключэння разам з аўтарскімі варыянтамі рукапісу вяртаецца аўтару (калектыву аўтараў). Другі асобнік захоўваецца ў ВМА да моманту заканчэння тэрміну дзеяння грыфа.

18. У выпадку прыняцця рашэння Прэзідыума Савета ВМА аб немэтазгоднасці прысваення грыфа ВМА дакументы, якія паступілі на адрас ВМА, вяртаюцца аўтару (калектыву аўтараў) разам з заключэннем ВМА і экспертным заключэннем. Пасля дапрацоўкі заўваг, указаных у экспертным заключэнні, дакументы і аўтарскі варыянт рукапісу вучэбнага выдання можа быць прадстаўлены ізноў, але не раней, чым праз 6 месяцаў.

Рэкамендавана да зацвярджэння Прэзідыумам Савета ВМА па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў

(Пратакол ад 16.04.2015 года № 1).

Дадатак 1

Рэкамендуемая структура рэцэнзіі
на аўтарскі арыгінал вучэбнага выдання

1. Назва аўтарскага арыгінала вучэбнага выдання, прапанаваны тыраж і год выпуску.

2. Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара (аўтараў), вучоная ступень і званне, месца працы, пасада.

3. Найменне і шыфр спецыяльнасці, назва дысцыпліны, па якой падрыхтаваны аўтарскі арыгінал вучэбнага выдання, і цыкла тыпавога вучэбнага плана, да якога належыць гэтая дысцыпліна.

4. Ацэнка структуры і зместу аўтарскага арыгінала вучэбнага выдання, адпаведнасць зместу вучэбнага выдання адукацыйнаму стандарту і праграме вучэбнай дысцыпліны.

5. Навізна зместу.

6. Адпаведнасць сучаснаму навуковаму ўзроўню (па адпаведным напрамку падрыхтоўкі).

7. Ступень асвятлення практычных пытанняў, іх актуальнасць.

8. Метадычны ўзровень матэрыялу, адаптыўнасць яго да адукацыйных тэхналогій.

9. Ступень захавання псіхолага-педагагічных патрабаванняў да зместу і афармлення вучэбнага выдання.

10.Пералік пастаронкавых заўваг (у выпадку вялікай колькасці заўваг дапускаецца спасылка на іх па тэксце).

11. Мэтазгоднасць (немэтазгоднасць) прысваення грыфа. Пры гэтым дапушчальныя фармулёўкі:

– Вучэбнае выданне мэтазгодна рэкамендаваць вучэбна-метадычнаму аб’яднанню па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці (назва спецыяльнасці (спецыяльнасцяў) з указаннем шыфра спецыяльнасці (спецыяльнасцяў) па ОКРБ 011- 2009) ;

– Вучэбнае выданне немэтазгодна рэкамендаваць вучэбна-метадычнаму аб’яднанню па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасці (назва спецыяльнасці (спецыяльнасцяў) з указаннем шыфра спецыяльнасці (спецыяльнасцяў) па АКРБ 011-2009) .

Рэцэнзент
пасада, навуковая ступень,
вучонае званне эксперта ________________ (ініцыялы, прозвішча)

Падаецца службовы адрас, кантактныя тэлефоны, адрас электроннай пошты.

Дадатак 2

Прыкладная форма
суправаджальнага ліста
Рэктару БДУКМ,
старшыні вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі
ў сферы культуры і мастацтваў.
Ю.П.Бондару

Аб прысваенні грыфа ВМА

______________________________________________________________

______________________________________________________________

Назва ўстановы

просіць разгледзець вучэбнае выданне ______________________________
аўтара (аў) ___________________________________________________
______________________________________________________________
і прысвоіць грыф вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў сферы культуры і мастацтваў (указваецца від вучэбнага выдання) па вучэбнай дысцыпліне (у адпаведнасці з вучэбным планам) для спецыяльнасці (указваецца код і назва спецыяльнасці (спецыяльнасцяў).

Вучэбнае выданне ўключана ў папярэдні план выпуску на (называецца год) і будзе выдадзена на базе і за сродкі выдавецтва ____________________

Плануемы тыраж ________________

Прыкладаюцца дакументы:
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

Кіраўнік установы

Выканаўца _________________
___________________________

Дадатак 3

ДАВЕДКА
пра аўтара (аўтараў)

Назва работы ______________________________________________________

Прозвішча аўтара (аўтараў) _________________________________________

Імя аўтара (аўтараў) ______________________________________________

Імя па бацьку аўтара (аўтараў) _____________________________________

Месца працы аўтара (аўтараў) _______________________________________

пасада ________________________________________________________

Вучоная ступень ___________________________________________________

Вучонае званне ____________________________________________________

Адрас для сувязі, тэлефоны (працоўны, мабільны), e-mail ________________